Акадэмія паслядыпломнай адукацыі

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ «АД ЛАКАЛЬНЫХ ПРАЕКТАЎ – ДА МАСАВАЙ ПРАКТЫКІ»

НАРОДНАЯ Асвета

# ЗАХОЎВАЕМ НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ: З ВОПЫТУ ІНАВАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## Рэалізацыя інавацыйнага праекта па ўкараненні этнакультурных тэхналогій для пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі



**Р. І. Дравіца,**
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Азёркаўскай СШ Мастоўскага раёна

Веданне гісторыі сваёй малой радзімы, традыцый, звычаяў і абрадаў, авалоданне народнымі рамёствамі, далучэнне да дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва спрыяюць усведамленню падрастаючым пакаленнем таго, што беларускі народ самабытны і непаўторны. Менавіта таму мы паставілі перад сабой задачу арганізацыі мэтанакіраванай працы па фарміраванні ў навучэнцаў погляду на нацыянальную культуру як на фундаментальную духоўную каштоўнасць народа, што і лягло ў аснову рэалізацыі ў нашай школе **рэспубліканскага інавацыйнага праекта «Укараненне этнакультурных тэхналогій для пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі»** (2018–2022 гг.).

Выхаванне грамадзяніна і патрыёта, здольнага берагчы і памнажаць культурныя традыцыі, адбываецца ў першую чаргу падчас факультатыўных заняткаў «Вытокі роднай мовы», «Беларускае красамоўства», «Храмы, замкі і палацы Беларусі», «Гэты няпросты просты сказ», «Складаны сказ без складанасцей», «Абагульняючы курс па гісторыі Беларусі» і ажыццяўленне распрацаваных у школе гуманітарных праектаў «Скарбы роднага краю ў кожны дом» і «Прыродная спадчына – возера Азяранскае». У нас працуе музей «Наша спадчына», дзе праводзяцца шматлікія мерапрыемствы і музейныя ўрокі, а таксама арганізаваны заняткі ў аб’яднаннях па інтарэсах «Спадчына» (па аўтарскай праграме Т. А. Галавач) і «Рэчанька». Намаганнямі калектыву настаўнікаў і вучняў створаны інтэрнэт-праекты «Выхавай патрыёта», «Віртуальны музей «Спадчына», «Інтэрактыўная карта Азёрак», «Скарбніцы маёй радзімы», «Нашчадкі традыцый», відэафільмы «Родная вёска», «Святкуем Вялікдзень», «Гуканне вясны», квесты «Па сцежках спадчыны», «Аб чым гавораць экспанаты музея», «Прадметы побыту на новы лад», вечарына «Як у нашай бабкі смачныя аладкі», сцэнарыі фальклорных свят «Наперад – у мінулае», «Калядкі», «Масленіцу гукаем – вясну сустракаем», «Гуканне вясны», «Святкуем Вялікдзень». Вынікі працы сістэматычна адлюстроўваюцца на сайце інавацыйнага праекта (https://sites.google.com/view/innovassio/галоўная).

Візітнай карткай нашай мясцовасці з’яўляецца танцавальны стыль «Котчынская кадрыля», з 2010 года занесены ў спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА. У школе праводзіцца вялікая работа па захаванні і перадачы маладому пакаленню культурных каштоўнасцей: падчас усіх важных раённых мерапрыемстваў, у тым ліку свята «Па сцежках спадчыны», нашы дзеці выконваюць знакаміты танец (https://www.youtube.com/watch?v=bOM9vvtHwno). Школьнікі пад кіраўніцтвам Т. А. Галавач распрацавалі праект «Жыве котчынская кадрыля», які на раённым і абласным этапах конкурсу праектаў даследчых работ краязнаўчага кірунку адзначаны дыпломамі І ступені. Трэба падкрэсліць, што дзеці з гонарам абаранялі яго на сцэне Нацыянальнага палаца мастацкай творчасці ў Мінску.

Сёння педагогі Азёркаўскай СШ на старонках часопіса «Народная асвета» дзеляцца эфектыўным інавацыйным вопытам і прадстаўляюць аўтарскія матэрыялы, якія будуць карысныя настаўнікам для арганізацыі пазакласных мерапрыемстваў.



# Прафесійная пераклічка

## Гульня-падарожжа ў музей традыцыйнага беларускага побыту



**І. А. Гарбацэвіч,**
настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі
Азёркаўскай СШ Мастоўскага раёна

Музей – гэта месца, дзе можна дакрануцца да мінулага, пазнаёміцца з прадметамі побыту і жыцця продкаў, зразумець, чым яны жылі, як працавалі і як адпачывалі. У школьным музеі «Наша спадчына», экспазіцыя якога актыўна выкарыстоўвалася ўдзельнікамі інавацыйнага праекта, працуюць зала «Беларуская хатка» і зала баявой славы, створаны выставы «Гісторыя маёй вёскі», «Гісторыя маёй школы», «Воіны-афганцы». На яго базе арганізуюцца шматлікія мерапрыемствы. Адно з іх, **гульню-падарожжа ў музей традыцыйнага беларускага побыту**, прапануем вашай увазе.

**Мэты:** актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў, знаёмства з культурай беларусаў, фарміраванне ў вучняў музейнай культуры, выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці.

**Ход гульні-падарожжа**

**І. Уводная частка**

*Вядучыя запрашаюць дзяцей прыняць удзел у тэматычнай гульні, якая арганізуецца на базе музея. Школьнікі маюць магчымасць не толькі пачуць аповед пра экспанаты музея, але і пазнаёміцца з імі падчас самастойнага даследавання – такім чынам у вучняў фарміруецца музейная культура.*

**Вядучы 1.** Запрашаем усіх прысутных адправіцца ў пазнавальнае падарожжа ў мінулае. Але каб знайсці правільную дарогу, вам патрэбна выканаць шэраг заданняў.

**Заданне 1.** Успомніце і раскажыце вершы пра родны край.

**Заданне 2.** Адкажыце, як называецца збан без ручкі (*гладыш*); лыкавы абутак сялян на анучы (*лапці*); плыткая металічная пасудзіна круглай формы для смажання (*патэльня, скаварада*); вырабы са скуры або з іншых матэрыялаў, прызначаныя для нашэння на нагах (*абутак*); дэталь у ткацкім станку, якая мае форму чоўна (*чаўнок*); пляскаты драўляны брусок з ручкай, якім абівалі лён (*пранік*); дзіцячая цацка ў выглядзе фігуркі чалавека (*лялька*).

**Вядучы 2.** Гэта была своеасаблівая размінка. А зараз запрашаем усіх у нашу беларускую сялянскую хатку. Тут вы зможаце даведацца, як жылі, працавалі і адпачывалі нашы продкі.

**ІІ. Асноўная частка**

**Вядучы 1.** Вясковыя жыхары стагоддзямі жылі так: большасць работ выконвалі ўручную, самі забяспечвалі сябе ўсім неабходным і карысталіся самабытнымі прыладамі працы. Усе гэтыя прадметы даўно ўжо сталі музейнымі экспанатамі. Іх паступова замянілі сучасныя бытавыя прыборы, якія зрабілі працу чалавека непараўнальна лягчэйшай і без якіх мы сёння не ўяўляем свайго жыцця.

**Вядучы 2.** У кожным доме ёсць ужо звыклыя для нас тэлевізары, халадзільнікі, прасы, газавыя пліты, пральныя машыны. Калі нам патрэбен хлеб ці іншая ежа, мы ідзём у магазін. У адрозненне ад нас нашы продкі жылі зусім інакш.

**Вядучы 1.** Мы прапануем вам здзейсніць падарожжа ў мінулыя стагоддзі, калі ўсё патрэбна было вырабляць самім. Адпраўляемся ў свет старадаўніх рэчаў!

*Кожны прысутны атрымлівае малюнак з выявай сучаснага прадмета.*

***Набор малюнкаў:*** хлеб, масла, газавая пліта, электрычная лямпачка, шафа для адзення, прас, вадаправодны кран, кавамолка, збожжаўборачны камбайн, мабільны тэлефон.

**Заданне 3.** Азнаёмцеся з экспазіцыяй беларускай сялянскай хаты, знайдзіце там рэч або некалькі, што адпавядаюць таму прадмету, адлюстраванне якога вы атрымалі. Прачытайце інфармацыю, размешчаную побач з экспанатамі, і зрабіце апісанне прадмета і ўсяго тэхналагічнага працэсу.

*Дзеці вывучаюць экспазіцыю і рыхтуюць свае паведамленні. Паслядоўнасць адказаў можа быць розная: па ступені значнасці прадмета ў жыцці чалавека або па меры гатоўнасці вучняў да адказу. Набор малюнкаў таксама можа быць розны ў залежнасці ад наяўнасці экспанатаў у музеі. Агульнымі намаганнямі складаецца карта падарожжа: у якасці прыкладу прапануем яе фрагмент (поўная карта падарожжа прадстаўлена на сайце часопіса www.n-asveta.by).*

| Адлюстраванне прадмета | Музейны прадмет, апісанне тэхналагічнага працэсу |
|---|---|
|  Хлеб |  Працэс выпечкі хлеба ў хатніх умовах пачынаўся з замешвання хлебнага цеста ў драўлянай дзяжы – яго ставілі падыходзіць («падрастаць») у цёплае месца. Затым з цеста рабілі боханы хлеба і з дапамогай драўлянай хлебнай лапаты ставілі ў напаленую печ. Печ зачынялі засланкай, каб з яе не выходзіў гарачы дух. Праз пэўны час яе адчынялі і назіралі, як падрастаюць боханы. Гатовы хлеб вымалі драўлянай лапатай і клалі на стол астываць, прыкрыўшы зверху ручніком. Захоўваўся такі хлеб каля двух тыдняў і не псаваўся |

**III. Заключная частка**

**Вядучы 1.** У былыя часы нашы продкі шмат працавалі. Пэўна, вы пераканаліся, што яны ўсё ўмелі рабіць сваімі рукамі.

**Вядучы 2.** Умелі яны і адпачываць. Прычым бавілі вольны час не з гаджэтамі, а наладжвалі актыўныя зносіны паміж сабой, спяваючы песні, расказваючы вясковыя навіны, адгадваючы загадкі.

**Заданне 4.** Адгадайце загадкі і пакажыце прадметы, аб якіх ідзе гаворка.

1. То яна пячэ бліны, то паказвае нам сны. *(Печ.)*
2. Знізу вузкі, зверху шыркам, а завецца... *(Чыгунком.)*
3. З гарачай пячы кашу лёгка валачы.
І не трэба многа сілы,
Калі возьмеш у рукі... *(Вілы.)*
4. Прыходзяць да мяне з маршчынамі і складкамі,
Выходзяць ад мяне прыгожыя і гладкія. *(Прас.)*
5. Чорны конь смела скача ў агонь. *(Качарга.)*
6. Што за звер такі стаіць –
Зімой есць, а летам спіць.
Без крыві, але гарачы,
Сядзеш зверху – ён не скача. *(Печ.)*

*Вядучыя падводзяць вынікі гульні і просяць наведвальнікаў музея выказаць свае ўражанні.*

# Квест «Па сцежках спадчыны»



**Т. В. Пчэльнік,**
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
Азёркаўскай СШ Мастоўскага раёна

Падчас рэалізацыі інавацыйнага праекта мы вялікую ўвагу надавалі далучэнню вучняў да гістарычнага мінулага. Для вырашэння гэтай задачы быў распрацаваны шэраг мерапрыемстваў. Адным з іх стаў **квест «Па сцежках спадчыны»**, прызначаны для вучняў малодшых класаў. Падчас гэтай гульні каманды, рухаючыся згодна з падказкамі, якія дае настаўнік, выконваюць заданні. Па выніках працы каманды атрымліваюць канверты з ключавымі словамі – з іх неабходна скласці фразу на этапе падвядзення вынікаў.

**Мэты:** выхаванне ў вучняў нацыянальнай самасвядомасці праз асэнсаванне традыцый і звычаяў беларусаў; развіццё ў дзяцей кемлівасці, памяці, увагі; прывіццё цікавасці да вывучэння роднай

мовы, матывацыя дзяцей да выкарыстання яе ў штодзённым жыцці.

**Ход квесту**

**I. Уводная частка**

*Настаўнік вітае ўдзельнікаў і прапануе ім паслухаць песню «Спадчына» ў выкананні групы «Песняры» (сл. Янкі Купалы, муз. Ігара Лучанка). Дзеці разважаюць аб тым, што такое спадчына. Педагог падводзіць іх да высновы, што спадчына – гэта скарб, які пакінулі нам нашы продкі, а самы вялікі скарб – гэта наша мова.*

**Настаўнік.** А ці ведаеце вы, што наша мова адна з самых мілагучных у свеце – гэта ў многім абумоўлена мяккасцю, якая перадаецца ад аднаго гука другому. А яшчэ беларуская мова – адна з самых багатых у свеце: калі ў літаратурнай мове налічваецца дзесьці 250–500 тысяч слоў, то ў дыялектнай – каля 2 мільёнаў.

*Настаўнік заклікае вучняў адправіцца ў падарожжа, каб адшукаць скарбы.*

**II. Асноўная частка**

**Падказка 1.** Да яе выклікаюць, пісаць на ёй застаўляюць, а пасля анучкай усё выціраюць. (*Дошка.*)

*На дошцы запісаны ўмовы задання.*

**Заданне 1.** Адгадайце загадкі.

1. Сіняя посцілка ўвесь свет накрыла. (*Неба.*)
2. Глянеш – заплачаш, а ўсе яму рады. (*Сонца.*)
3. Ляцеў птах, на ваду – бах. Вады не скалыхнуў, на дно патануў. (*Снег.*)
4. Стукае, грукае, а нідзе не відаць. (*Гром.*)
5. І тонкі, і доўгі, а з травы не відаць. (*Дождж.*)
6. Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці. (*Ноч.*)
7. Чаго на свеце багацей няма? (*Зямлі.*)
8. Што без вады плыве? (*Воблака.*)

**Падказка 2.** Гавораць: ён стаіць, спяшаецца, ідзе і нават крышку адстае. (*Гадзіннік.*)

*Пад гадзіннікам знаходзіцца файл з наступным заданнем.*

**Заданне 2.** Узнавіце прыказкі, злучыўшы пачатак і канец.

1. Жураўлі ляцяць высока *(зіма яшчэ далёка).*
2. Зімовы дзянёк *(што камароў насок).*
3. Сем разоў адмер *(адзін раз адрэж).*
4. У гасцях добра *(а дома лепш).*
5. Чалавек без працы (*як птушка без крылаў*).
6. Новых сяброў набывай (*а старых не забывай*).

**Падказка 3.** У нашым класе пад акном ёсць гарачы гармонік: не спявае, не іграе, толькі клас абаграе. (*Радыятар.*)

*На падаконніку ляжыць файл з чарговым заданнем.*

**Заданне 3.** Вызначце, з якіх казак наступныя ўрыўкі.

1. Пачаў ён іграць яшчэ змалку. Бывала, пасучы валоў, зробіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы скубці траву перастаюць – натапыраць вушы ды слухаюць. У лесе птушкі прыціхнуць, нават жабы ў балоце не крумкаюць. (*«Музыка-чарадзей».*)

2. Стаў воўк у лагчынцы, разявіў рот і чакае. А баран узбег на горку, разагнаўся ды – бах! – рагамі ваўка ў галаву. Аж іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка. Ачухаўся воўк, пакруціў галавою і разважае: «Цікава: з'еў я яго ці не?» *(«Лёгкі хлеб».)*

3. Пеўнік добры быў, пусціў лісіцу ў хатку, а лісіца – цап! – ухапіла яго і панесла дадому. Апамятаўся пеўнік, закрычаў на ўвесь лес: «Коце, браце! Мяне ліска нясе ў высокія горы, у глыбокія норы, па барах, па карчах, аж бярэ мяне страх!» *(«Коцік, пеўнік і лісіца».)*

4. Дзік ляжаў, ляжаў у моху ды ад страху пачаў хвастом варушыць. Кот падумаў, што мыш з норкі вылазіць. Скокнуў туды і ўчапіўся кіпцюрамі ў дзікаў хвост. Як усхопіцца дзік, як кінецца наўцёкі! Толькі галлё трашчыць. Кот напужаўся ды скок на дуб! *(«Як кот звяроў напалохаў».)*

**Падказка 4.** Успомніце горад, назва якога паходзіць ад ракі Віцьба, знайдзіце герб гэтага горада. (*Віцебск.*)

*За гербам Віцебска знаходзіцца файл з заданнем.*

**Заданне 4.** Узнавіце радкі калыханкі.

Люлі, люлі, люлі,
Дзеткі ўсе... (*паснулі, ляглі*).
Не спіць толькі коця,
Ходзіць па... (*балоце, лесе*).
Застудзіў ён лапку,
Прыйшоў грэцца ў... (*хатку, на печку*).
Недзе коцю дзецца,
(*Лапачцы, ножачцы*)... пагрэцца.
Палез на палаткі,
Спалохаўся... (*бабкі, мышкі*).

**Падказка 5.** Успомніце назву горада, які ўзнік на тым месцы, дзе некалі пасяліўся млынар Менеск і цякла рэчка Менка. Знайдзіце герб горада. (*Мінск.*)

*За гербам Мінска – файл з заданнем і малюнкамі.*

**Заданне 5.** Рашыце філворд, знайшоўшы назвы беларускіх свят. Суаднясіце кожную назву з малюнкам. Раскажыце, што вы ведаеце пра гэтыя святы.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А | Б | Г | О | Л | Д | Ж | Т | Б | Ю | Ж | З |
| О | К | У | П | А | Л | Л | Е | Л | Ж | Э | Ю |
| О | Ж | Т | Б | Д | А | Ж | Ы | Н | К | І | Р |
| М | А | С | Л | Е | Н | І | Ц | А | Г | Ю | Э |
| К | Л | М | Н | К | А | Л | Я | Д | Ы | З | С |
| П | В | Я | Л | І | К | Д | З | Е | Н | Ь | Г |
| Ж | Т | Б | Ю | Ж | В | О | Д | З | Я | Д | Ы |

*Адказы:* Купалле, Дажынкі, Масленіца, Каляды, Вялікдзень, Дзяды.

**III. Заключная частка**

Са слоў у канвертах дзеці складаюць фразу «Мова продкаў маіх і нашчадкаў». Настаўнік арганізуе абмеркаванне і падводзіць вучняў да высновы, што сваю спадчыну трэба ведаць, вывучаць, берагчы і, як нашы продкі, перадаць наступным пакаленням.

# Вечарына «Як у нашай бабкі смачныя аладкі»



**Т. М. Шэлястовіч,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі
Азёркаўскай СШ Мастоўскага раёна

**Вечарына «Як у нашай бабкі смачныя аладкі»** праводзіцца ў актавай зале. Сцэна аформлена ў стылістыцы беларускай хаты. Гаспадыня вечарыны бабка Агапка прапануе вучням малодшых класаў вывучаць беларускую культуру праз удзел у конкурсах і гульнях.

**Мэта:** матывацыя дзяцей да вывучэння беларускага фальклору.

**Ход вечарыны**

**I. Уводная частка**

*Дзеці выконваюць народную песню «Ох, і сеяла Ульяніца лянок». На сцэну выходзіць бабка Агапка. Астатнія ўдзельнікі рассаджваюцца па лаўках.*

**Бабка Агапка.** Добры дзень, мае даражэнькія. Мяне завуць бабка Агапка. Я прыйшла да вас у госці, ды не з пустымі рукамі, а з living рознымі рэчамі і гасцінцамі, гульнямі і прыказкамі.

**II. Асноўная частка**

**Бабка Агапка.** Беларускія людзі заўсёды славіліся сваёй гасціннасцю і ветлівасцю. Можа, і вы мне назавяце ветлівыя словы, якія мы ўжываем, калі запрашаем гасцей. (*Адказы ўдзельнікаў.*) Так, гасцей запрасілі. Раз мы ў беларускай хаце, то і гаварыць будзем на беларускай мове.

**Заданне.** Назавіце рэчы па-беларуску (*бабка паказвае лыжку, відэлец, кубак, збанок, абрус, талерку, фартух*).

**Бабка Агапка.** Я ведаю, што дзеці вельмі любяць гуляць. Прапаную гульню, якая называецца «Гарачыя гаршчочкі». На ўслончыках стаяць гаршчочкі. Вам патрэбна ўзяць ручнік і перанесці гаршчочак на супрацьлеглы ўслончык, затым завязаць фартух і збегаць за лыжкай.

*Дзеці дзеляцца на каманды і прымаюць удзел у гульні.*

**Бабка Агапка.** За сталом беларускай хаты звычайна збіралася ўся сям'я, ад старога да малога: так перадаваўся набыты вопыт, веды, сямейныя традыцыі. Арганізацыяй трапезы займаўся сам гаспадар дома. Ён сядаў на покуці, спачатку чытаў малітву, затым рэзаў хлеб, дзяліў мяса і сачыў за парадкам. А гаспадыня ў пэўнай паслядоўнасці падавала розныя стравы. Ці ведаеце вы, якая самая любімая страва ў беларусаў? Каб адказаць на пытанне, адгадайце загадку.

Славен край наш ёй здаўна,
Трыста разам страў – яна.
І зімой, і летнім часам
На яе мы вельмі ласыя. (*Бульба.*)

Якія стравы можна прыгатаваць з бульбы? (*Адказы дзяцей.*)

*Арганізуецца гульня «Пасадзі бульбу»: каманды на хуткасць удзельнічаюць у эстафеце.*

**Бабка Агапка.** Прыйшоў час для загадак.

1. Улетку шэранькі, узімку беленькі.
Доўгія вушы мае, хутка ў лес уцякае. (*Заяц.*)
2. Летам апранаецца, а зімой распранаецца. (*Дрэва.*)
3. Без рук малюе, без зубоў кусае. (*Мароз.*)
4. Хто нас корміць, поіць, а есці не просіць? (*Зямля.*)
5. Было жоўтым, вырасла зялёным.
Сонца пацалавала, зноў жоўтым стала. (*Жыта.*)

*Дзеці загадваюць адзін аднаму загадкі.*

**Бабка Агапка.** Ёсць такая прыказка: «Хлеб на стале – свята ў доме». Ці ведаеце вы, чаму так гаварылі? (*Адказы дзяцей.*) Здаўна хлеб быў галоўнай ежай людзей, таму і казалі: «Без хлеба няма абеда». Хлеба не заўсёды хапала да новага ўраджаю, і яго вельмі шанавалі: у кавалачка, які выпадкова падаў з рук ці са стала, прасілі прабачэння. На кожны дзень хлеб пяклі з жытняй мукі, а белы хлеб пяклі з пшанічнай мукі толькі на вялікія святы.

**Заданне.** Дайце вызначэнні.

1. Вясельны абрадавы пірог – гэта (*каравай*).
2. Цвёрды знешні слой хлеба – гэта (*скарынка*).
3. Адрэзаны нажом плоскі кавалак хлеба – гэта (*скіба*).
4. Кавалачак хлеба, адрэзаны ад непачатага бохана, – гэта (*акраец*).

**Бабка Агапка.** А яшчэ беларускі народ – вельмі працавіты. Калі добра працуеш, нельга забываць пра песні і танцы.

*Падрыхтаваныя загадзя хлопцы і дзяўчаты спяваюць прыпеўкі.*

**III. Заключная частка**

**Бабка Агапка.** Павесялілі, мае дзетачкі, старую. Час збірацца дахаты. А што вы раскажаце бацькам дома? (*Дзеці дзеляцца ўражаннямі.*)

*Выконваецца песня «Бывайце здаровы!».*

## ЛІТАРАТУРА

1. **Алексютовіч, Л. К.** Беларускія народныя танцы, карагоды, гульні: вуч. дапаможнік / Л. К. Алексютовіч; пад рэд. М. Я. Грынблата. – Мінск: Вышэйшая школа, 1978. – 528 с.
2. **Кавалёва, Р. М.** Беларуская вусна-паэтычная творчасць: вучэб.-метад. комплекс / Р. М. Кавалёва. – Мінск, 2005. – 151 с.